Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

ЯК ПРАВІЛЬНА ВЫКАРЫСТОЎВАЦЬ СНЕГ У САДЗЕ

Снег — гэта замёрзлая вада, але на 95 % ён складаецца з паветра. Кожная сняжынка — напоўнены паветрам крышталь з паветранай праслойкай вакол. Менавіта таму снег, такі халодны навобмацак, з'яўляецца цудоўным уцяпляльнікам. Цеплаправоднасць бялюткага снегу супастаўная з цеплаправоднасцю драўніны. Але важна, што гэта датычыцца толькі свежага, рыхлага і пухнатага снегу.

Засыпаем карані

Большасці раянаваных дрэў і кустоў будзе дастаткова, калі атуліць снегам прыствольны круг, а травяністым раслінам — месца пасадкі, дзе пад зямлёй захоўваецца каранёвая сістэма. Зрухі глебы пры скачках тэмпературы могуць пашкодзіць далікатныя карані, асабліва маладых раслін. Снежная праслойка зберажэ зямлю ад рэзкіх тэмпературных кантрастаў.

Хаваем каранёвую шыйку дрэў

Таксама лёгка пашкоджваецца марозам каранёвая шыйка — пераход кораня ў ствол — у тых відаў, у якіх яна павінна знаходзіцца над паверхняй глебы. Напрыклад, у пладовых дрэў. Для такой хованкі цалкам дастаткова звычайнага снегападу. Але ў маласнежныя марозныя зімы снег трэба падграбаць дадаткова.

Закідваем снегам кусты

Значна больш снегу спатрэбіцца, каб абараніць кусты, якія цвітуць вясной, а закладваюць кветкавыя пупышкі з мінулага года. У асабліва суровыя зімы нават у цалкам раянаваных раслін кветкавыя пупышкі часта падмярзаюць, і расліна не цвіце і не дае пладоў. Такія кусты трэба хаваць «з галавой», закідваць снегам цалкам. Калі зіма з малой колькасцю ападкаў, трэба рабіць гэта штучна.

Захутваем месца прышчэпкі

Яшчэ адна ўразлівая частка расліны — месца прышчэпкі. Месца злучэння дзвюх розных раслін, хоць і яно даўно зраслося, лёгка пашкоджваецца марозам. Яго варта абараняць дадаткова, асабліва ў маладых або нядаўна прышчэпленых раслін і цеплалюбівых відаў. Але ў дадзеным выпадку не заўсёды можна абысціся толькі снегам. Натуральныя ці штучныя гурбы дапамогуць, толькі калі месца прышчэпкі знаходзіцца недалёка ад зямлі.

Затрымліваем снег

Мяккія гурбы карысныя для раслін, але фарміруюцца яны часта не там, дзе нам трэба. У месцах, якія прадзімаюцца, нават у снежныя зімы не хапае абароны раслінам. На ўчастку для снегазатрымання можна, напрыклад, пасадзіць высокія густыя расліны — ідэальна падыходзяць іглічныя.

Затрымаць снег можна і з дапамогай штучна створанага рэльефу. Напрыклад, каля падпорнай сценкі, звернутай да ветру, будзе фарміравацца гурба, і расліны, якія растуць пад ёй, будуць накрытыя.

Перашкодай ветру будуць не толькі стацыянарныя пабудовы — падпорныя сценкі або платы, — але і часовыя: загараджальныя шчыты, якія выстаўляюць толькі зімой. Іх можна зрабіць з розных матэрыялаў, але лепш — з пранікальных. Шчыты з сеткі, лазы ці саломы будуць больш надзейныя, чым суцэльныя — з фанеры і дрэва. Апошнія могуць зваліцца пад націскам ветру і пашкодзіць размешчаныя ззаду іх расліны.

Дадаткова затрымлівае снег і фактурны матэрыял, прычым не толькі вертыкальныя шчыты, але і гарызантальныя паверхні. Менавіта таму добра абараняць расліны яловымі лапкамі. Касматыя галіны іглічных ствараюць дадатковую паветраную праслойку, іголкі затрымліваюць снег, не даючы яму інтэнсіўна выдзімацца. Гэта асабліва важна ў самым пачатку зімы, калі снежнае покрыва яшчэ толькі ўтвараецца. У сярэдзіне зімы, калі снежная шапка можа стаць занадта цяжкай, галіны пераразмяркоўваюць нагрузку, а пасля адлігі, калі снег ушчыльніцца, захаваюць паветра вакол раслін. Акрамя лапак, для хованкі, якая затрымлівае снег, падыдзе сухая салома і нават абрэзаныя галінкі ліставых дрэў.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.19	16.47	7.28
Віцебск —	9.16	16.29	7.13
Магілёў —	9.09	16.37	7.28
Гомель —	8.57	16.42	7.45
Гродна —	9.33	17.04	7.31
Брэст —	9.25	17.13	7.48

Месяц

Маладзік 7 снежня.
Месяц у сузор'і Вадаліва.

Імяніны

Пр. *Парамона.*
К. *Адэлаіды, Жанны, Аляксандра, Кандрата.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

12 СНЕЖНЯ

1918 год — нарадзіўся (в. Гайшын Слаўгарадскага раёна) Кастусь Кірэенка, беларускі паэт, заслужаны дзеяч культуры Беларусі. У 1945—1962 гадах працаваў у часопісе «Беларусь», з 1962-га — галоўны рэдактар часопіса «Бярозка», у 1972—1986 гадах — часопіса «Полымя». Аўтар зборнікаў «Пасля навальніцы», «Мая рэспубліка», твораў для дзяцей (зборнікі «Зялёнае рэха», «Вясна-красна») і інш. Некаторыя вершы К. Кірэенкі пакладзены на музыку. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі. Памёр у 1988 годзе.

1920 год — на 2-м Усебеларускім з'ездзе Саветаў рабочых, сялянскіх, батрацкіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў прыняты дапаўненні да Канстытуцыі БССР 1919 г. З'езд выказаўся за пераход усіх дзяржаўных устаноў на беларускую мову.

1979 год — у вёсцы Раўбічы Мінскага раёна адкрыты Музей беларускага народнага мастацтва. З 2001 года — філіял Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь. Пастаянная экспазіцыя музея размешчана ў вялікай зале і дзвюх прыбудовах. Экспазіцыя падзелена на дзве часткі: традыцыйнае мастацтва XVIII — 1-й паловы XX ст. і сучаснае — з 1960—1970-х гг. У экспазіцыі тканыя вырабы, прадметы хатняга ўжытку. Тут прадстаўлены таксама вырабы з в. Неглюбка Веткаўскага і Моталь Іванаўскага раёнаў, ганчароў з пасёлка Івянец Валожынскага раёна і іншых мясцін.

1915 год — нарадзіўся Фрэнк Сінатра, амерыканскі эстрадны спявак, акцёр, рэжысёр, музыкант і аранжыроўшчык. У 1942 годзе быў прызнаны самым папулярным спеваком ЗША. За 50 гадоў на эстрадзе запісаў больш за 200 альбомаў і зняўся ў 58 фільмах. Уладальнік «Оскара» — найвышэйшай узнагароды Амерыканскай акадэміі кінамастацтва за ролю ў фільме «Адсюль у вечнасць» і некалькіх музычных прэмій «Грэмі», якія прысуджаюцца Нацыянальнай акадэміяй мастацтва і тэхнікі грамзапісу. Памёр у 1998 годзе.

1928 год — нарадзіўся Чынгіз Айтматаў, народны пісьменнік Кыргызстана, дыпламат, акадэмік АН Кыргызстана. Аўтар аповесцяў «Джаміля», «Белы параход», раманаў «Плаха», «Калі падаюць горы» і іншых. Памёр у 2008 годзе.

1928 год — нарадзіўся Леанід Быкаў, савецкі акцёр і рэжысёр, заслужаны артыст РСФСР, народны артыст УССР. Здымаўся ў фільмах «Лёс Марыны», «Максім Перапяліца», «Дарагі мой чалавек», «Добраахвотнікі», «У бой ідуць адны старыя» і інш. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Украінскай ССР. Памёр у 1979 годзе.

1959 год — XIV сесія Генеральнай Асамблеі ААН прыняла рэзалюцыю аб заснаванні Камітэта па выкарыстанні касмічнай прасторы ў мірных мэтах.

УСМІХНЕМСЯ

Самага вялікага шчупака вагой 50 кілаграмаў злавіў рыбалоў з Глыбокага. Гэта на сем кілаграмаў больш, чым нахлусіў папярэдні рэкардсмен.

— Мы свайму начальніку на дзень нараджэння замовілі скрыпічны квартэт. Прыкінь, заходзіць ён у офіс, а яны іграюць. Класна атрымалася!

— А мы свайму замовілі дзвюх піяністак.

— Піяністак? Дзе ж там у вас можна іграць на піяніна?

— А яны і не ігралі. Ён з імі проста ў кабінеце зачыніўся...

Віталь прыйшоў дадому ў такім дрэнным настроі, што жонка, не ведаючы, чаго ён зараз больш хоча, легла голай у пельмені з бутэлькай гарэлкі ў руцэ.

— Скажыце, Соня, ад каго ў вас дзіця?

— Галоўным чынам ад Фімы.

Лепш за ўсё ў мяне атрымліваецца нічога не рабіць. Але мне пастаянна імкнуцца перашкодзіць.



caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 4526.

Нумар падпісаны ў 19.30 11 снежня 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12